* В I лиге слонимские команды возглавляли 11 главных тренеров (включая исполняющих обязанности). В таблице №5 после фамилии наставника — годы руководства клубом, баланс матчей и разность мячей, набранные очки и их процент.

* В завершение подборки вернемся к сезону-2014. Не первый год, взяв на вооружение систему «плюс-минус», применяемую в НХЛ, предлагаем список игроков ФК «Слоним», выступавших в 24-м чемпионате. Напомним, что балл игроку прибавляется, если он при взятии ворот соперника находился на поле, соответственно, вычитается — при пропущенном мяче. В таблице №6: в скобках — количество проведенных матчей. Футболисты, которые провели менее трети встреч, расположены в ее нижней части.

Александр ЗАХАРЕНКО

ФУТБОЛ. ИГРАЮТ ЮНОШИ

ВЫШЛИ В ФИНАЛЬНЫЙ ЭТАП

На стадионе «Газпром трансгаз Беларусь» прошли игры предварительной стадии «Олимпийские дни молодёжи» среди игроков 2000 г. р. В соперники к команде ДЮСШ №1 пожаловали их сверстники из Дятлово и Зельвы.

Игры прошли при огромном игровом и территориальном преимуществе слонимчан. Обе встречи закончились с одинаковым результатом — 4:0 в пользу хозяев.

В первой игре отличились Дмитрий Ремез, Эдуард Кононович — 2, Александр Малиновский, во второй — Павел Полуносик, Дмитрий Ремез, Александр Малиновский и Вильгельм Берг.

В середине апреля слонимских юношей ожидает нелёгкое испытание в финальной стадии соревнования, где они померятся силами с командами областного центра и Лиды.

ВЕСЕННИЕ ИСПЫТАНИЯ

Впервые после зимнего перерыва команды игроков Слонима и Лиды 2001 г. р. провели матчевую встречу. Ребята показывали неплохие игровые способности, а также проводили осмысленные командные действия.

Игра получилась. Победу праздновали слонимчане со счётом 3:1. Первый мяч в ворота гостей со штрафного забил Дмитрий Ремез, затем Дмитрий Близнюк с пенальти удвоил преимущество.


Под занавес встречи команды обменялись взятием ворот. Лидчане вначале сократили счёт, но в скоростной атаке Дмитрий Ремез установил окончательный результат.

По договорённости команды пробили послематчевые пенальти. И здесь лучше были хозяева — 4:2.

Егор ЖИГАЛИК

УСПАМІНЫ

МЫ РОДАМ З САВЕЦКАЙ АРМІІ


МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

НЕ УМЕЕШ ПІЛАВАЦЬ — НЕ ВУЧЫ ІНШЫХ

Ідзе рэканструкцыя артылерыйскага міні-палігона палка, дзе ў змадэляваных умовах афіцэры павінны праходзіць практыку вядзення артагню.

Займаюся мадэляваннем ландшафту мясцовасці. Радавы Салей пілуе дошку для макета.

Заходзяць нампаліт палка падпалкоўнік Бандарэнка і камандзір дывізіёна падпалкоўнік Казынка. Нампаліт пачаў павучаць салдата, як трэба пілаваць. Тут камандзір дывізіёна не вытрымлівае і загадвае салдату: "Радавы Салей! Пакладзіце пілку". Той разгублены кладзе інструмент на падлогу. Надалей Казынка звяртаецца да Бандарэнкі: "Пакажы салдату, як ты пілуеш". Той раз шмаргануў, другі. Нічога добрага не атрымліваецца. Тады камандзір дывізіёна кажа: "Як не ўмееш рабіць сам, то не вучы іншых. Калі не маеш чым заняцца, то пайшлі пап'ем піва".

МАЦЮКАЦЦА ТРЭБА ЎМЕЦЬ

Служу месяц, паўгода ды пачынаю заўважаць, што салдаты мае загады выконваюць, але без асобай ахвоты. Спачатку меркаваў, што так адбываецца, бо служу два гады. Потым стаў распытваць, што да чаго ў іншых афіцэраў. Усе сходзіліся на думцы: не па форме аддаю загады. Больш папулярна патлумачыў начальнік штаба дывізіёна капітан Войцюш: "Аддаў загад — мацюкніся!"

Прыслухаўся, як аддаюць загады іншыя афіцэры, — усё так і ёсць. І тут мяне панесла. Поўны набор мацюкоў — дзе трэба і не трэба. Праўда, бачу, салдаты пачалі варушыцца. Вечарам таго дня да мяне падыходзіць радавы Джабараў, паўтараметровага росту з ботамі туркмен, дый чыста пачалавечы кажа: "Таварыш лейтэнант! Нэ ругайся большэ. Нэ ўмээш ругацца".

На тым мае мацюкальныя практыкаванні скончыліся, хоць без іх у войску не абысціся.

Язэп ПАЛУБЯТКА

НАВІНЫ МАСТОЎШЧЫНЫ

МАСТОЎСКІХ АБІБОКАЎ ПРАЦАЙ НЕ НАПУЖАЕШ

ЯЕ НЕ ХАПАЕ НАВАТ ПРАЦАЎЛАДКАВАНЫМ

У сувязі з эканамічным крызісам кіраўнікі арганізацый, не маючы чым плаціць заробкі, ад канца мінулага года адпраўляюць рабочых у адпачынак за свой кошт ці пераводзяць на скарочаны рабочы тыдзень.

Так, у адпачынак за свой кошт пайшлі многія работнікі УМС, ПМК-155, ДРБУ-208, Мастырэмбуд, частка дарожнікаў ЖКГ і іншыя. Пазней чатырохдзённы рабочы дзень займелі іншыя падраздзяленні ЖКГ.

Апошні месяц не асноўныя падраздзяленні ААТ "Мастоўдрэў" працуюць паводле прынцыпу тыдзень працы — тыдзень адпачынку. Змяншэнне рабочых дзён памяншае заробак. Адбываецца тое без узгаднення з прафсаюзам і без пратэсту рабочых. Толькі чыноўнікаў тое не датычыць. У іх поўны рабочы дзень, поўны рабочы тыдзень і платны адпачынак.

Адсутнасць працы ў афіцыйна працаўладкаваных зняла сацыяльную напружанасць сярод сацыяльнай групы насельніцтва, якую ўлады



па законе ўжо два месяцы таму назад намагаліся зрабіць "дармаедамі". Лейтматыў іх выказванняў цяпер адзін: "Дайце працу".

З чым звязана затрымка пачатку шматабяцанай дзяржаўнай кампаніі, пакуль не высветлена. Кожны наконт таго мае сваё меркаванне.

З тае нагоды карэспандэнту "ГС" выказаў сваю думку старшыня ВС РБ XII склікання, заслужаны юрыст РБ Мечыслаў Грыб.

—Здаецца, усё дакладна і зразумела. Усе працаздольныя грамадзяне РБ павінны быць заняты грамадска карыснай працай у добраахвотным ці прымусовым парадку. Сярод іншага, скажам, органы ўнутраных спраў атрымаюць дадатковы аб'ём працы, не звязаны са злачыннасцю. Аднак найперш тут гутарка ідзе аб элементарным захаванні патрабаванняў канстытуцыі, другіх заканадаўчых актаў РБ, міжнародных пагадненняў, падпісаных Беларуссю, аб забароне прымусовай працы і праў грамадзян. Згодна з ч. 4 арт. 41 Канстытуцыі РБ прымусовая праца ў Беларусі забараняецца. Там запісана, што "Прымусовая праца забараняецца, акрамя працы ці службы, вызначанай прыгаворам, ці ў адпаведнасці з законам аб надзвычайным ці ваенным становішчы". Відавочна, што закон не ўстанаўлівае ніякага пакарання за ўхіленне ад працаўладкавання. Міжнародная практыка барацьбы з асобамі, якія ўхіляюцца ад грамадска карыснай працы, сведчыць аб тым, што дзяржаўная ўлада прымае меры па навучанні і перападрыхтоўцы гэтых людзей новым, запатрабаваным у грамадстве спецыяльнасцям, забяспечвае іх працаўладкаванне і дастойны заробак без прымянення прымусовага працаўладкавання з дапамогаю праваахоўных і судовых органаў, — сказаў Мечыслаў Грыб.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ЯК ЯНО БЫЛО

КАДРЫ НОВАЙ УЛАДЫ

Пасля ўз'яднання Беларусі восенню 1939 года на яе заходнія абшары прыйшла новая ўлада ў асобах яе прыезджых прадстаўнікоў. Што гэта былі за людзі, сведчаць тагачасныя дакументы Гродзенскага дзяржаўнага архіва.


ЗАКОН
АБ УКЛЮЧЭННІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў САСТАЎ САЮЗА СОВЕЦКІХ СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭСПУБЛІК СА З'ЕДНАННЕМ ЯЕ З БЕЛАРУСКАЙ СОВЕЦКАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭСПУБЛІКАЙ

Самаўпраўства тых кадраў распачалося адразу пасля станаўлення тут савецкай улады. Надалей прыводзяцца выпіскі з пратаколаў паседжання Мастоўскага райкама партыі тае пары.

У пратаколе №3 ад 5 красавіка 1940 года пасяджэння Мастоўскага РК КП(б)Б запісана, што на пасяджэнні была разгледжана справа оперупаўнаважанага міліцыі пры станцыі Масты Крэцініна аб парушэнні сацыялістычнай законнасці. "Скарыстоўваючы службовае становішча, Крэцінін без санкцыі пракурора заходзіў у кватэры людзей і адбіраў неабходныя яму рэчы. У грамадзяніна Гал. узламаў замок і забраў рэчы. Іншых грамадзян, каб дасягнуць свайго, запалохваў". У выніку яго вызвалілі ад пасады, далі яму строгую вымову, але пакінулі ў партыі.

Крыху болей як праз тыдзень адбываецца новае пасяджэнне РК. На ім разглядаецца пытанне аб няправільных паводзінах ваеннага работніка раённага камісарыята Апраніча. Ён самавольна вызваліў два пакоі, дзе пражывалі настаўнікі, і пасяліўся там сам. Узяў сабе шафу з маёмасці высланых органамі НКУС асаднікаў. За гэта меў вымову.

Неўзабаве на райкаме была разгледжана персанальная справа нейкага Белацаркоўскага М. Г. Ён прыехаў у Мастоўскі раён у снежні 1939 года з Мазыра. Там засталіся жонка і дзеці. Грашыма іх не падтрымліваў. Звязаўся з жанчынай са Стральцоў. Ад'джаючы ў камандзіроўку ў другія раёны, ён пакідаў ёй зброю. Неўзабаве яна перасялілася да яго на кватэру. Жонка звярнулася ў партыйную арганізацыю з просьбай паўздзейнічаць на яго. Размовы на Белацаркоўскага не паўплывалі. Тады жонка дамаглася дазволу на прыезд у Масты. На кватэры ў яго адсутнасць застала сужыцельку. Апошняя ўчыніла бойку. Райкам палічыў немэтазгодным пакідаць тут Белацаркоўскага і адкамандзіраваў у распараджэнне Баранавіцкага абкама КП(б)Б.

Як злосны прагульшчык, у гэты час быў выключаны з партыі начальнік цэха фанернага завода Худалетаў М.

Загадчык райфінаддзела Дзінаў п'яны заснуў ля моста праз Нёман, прысвойваў казённыя грошы, забраў сабе карову былога асадніка. Выключаны з партыі, і справа накіравана ў суд.

Падобныя з'явы сталі насіць масавых характар, і таму ЦК КПБ(б) накіравала ў нізавыя арганізацыі ліст "Аб недахопах у працы партыі і Савецкіх органаў у Заходніх абласцях Беларусі". Той дакумент быў разгледжаны на Мастоўскім РК 5 лістапада 1940 года. У ім адзначаецца, што адзін з недахопаў у тым, што партыяй і савецкай уладай слаба прыцягваюцца мясцовыя кадры ва ўсе галіны кіравання. Ёсць выпадкі неабгрунтаванага зняцця мясцовых людзей з пасадаў. На іх месца прызначаюцца прыезджыя з усходніх абласцей і г. д. І тут жа адзначаецца, што з раёна адкамандзіраваны Ключэўскі І. Л., намеснік дырэктара МТС. Сваімі паводзінамі ён дэзарганізоўваў працу калектыву, п'янстваваў, супрацьпаставіў сябе дырэктару, не выконваў яго загадаў. МТС называў грамадскай плявальніцай. Райкам звярнуўся ў абкам партыі аб адкамандзіраванні яго ва ўсходнія вобласці.

Аднак ні пісьмо ЦК, ні пастанова РК істотным чынам стану спраў не змянілі. Ужо 7 студзеня 1941 года на першым пасяджэнні райкама была разгледжана справа старэйшага падатковага інспектара райфінаддзела Паўла Баранава аб антыпартыйных паводзінах.

Ён быў накіраваны ў Масты ў чэрвені 1940 года з Варонежскай вобласці, адразу пасля ўступлення ў партыю. Там у яго засталася жонка і чацвёра дзяцей. Пасля прыезду не стаў сям'і дапамагаць матэрыяльна. Тут ён звязаўся з Селіцкай, дачкою спекулянта. А праз яе са спекулянтамі і кулацкімі элементамі. Асабліва дапамагаў тром братам Крыніцкім. Даходную частку зменшыў болей чым на 11 тыс. рублёў, адпаведна зменшыў падатак. Кулаку Аляксандру Гарадку з Песак зменшыў прыбытак на 6,5 тысяч рублёў і г. д. У лісце да шлюбу ганіў савецкую ўладу і партыю. На тым пасяджэнні ён быў выключаны з партыі і асуджаны.

Гэта толькі невялікая частка парушэнняў, што чынілі новыя чыноўнікі на "вызваленых" тэрыторыях.

Язэп ПАЛУБЯТКА
Аляксей САБАСЦЯН

НА ЖЫЦЦЁВЫХ СКРЫЖАВАННЯХ

КАБ ТОЛЬКІ ДАЖЫЦЬ

Восень мала каго радуе, а Тамара Млынарчык наогул баялася пра яе думаць. Яшчэ ў самы разгар лета, акурат перад жнівом, муж Казімір выгнаў яе з дому. Як казалі ў іхняй вёсцы Курылёўцы, кабета вельмі распілася. Яе звольнілі з фермы, дзе працавала даяркай. Яна ўжо была на пенсіі, але ж многія вясковыя жанчыны ў такім узросце стараліся зарабіць капейку. Тамара да іх ліку не адносілася.

—Мне ўжо пяцьдзясят шэсць, — казала, прыйшоўшы ў вясковы магазін, хоць у яе пра гэта ніхто не пытаўся. — Хопіць і пенсіі на пражыццё.

—Твой жа Казімір старэйшы і ўсё адно на трактары працуе, — нагадвалі кабеты.

—Ну і няхай працуе, а з мяне хопіць.

У хатнюю работу Тамара таксама не ўлягала. З раніцы, пахмяліўшыся, спала амаль увесь дзень. Аднойчы, апаражніўшы бутэльку таннага віна, яна храпла ў запечку, а свіння праламала плот і вытаптала ў агародзе грады. Пра тое, што робіцца ў яго на сядзібе, гаспадару паведамілі вяскоўцы, якія разам убіралі на сенажаці атаву. Ён паімчаў на трактары ў вёску і быў настолькі раззлаваны ад убачанага, што схапіў на круку пры хляве вяроўку і моцна выцяў жонку. Яна спрасонку не магла нічога зразумець, спалохалася. Калі дайшло, з якой прычыны катаванне, у душы згадзілася, што кара справядлівая.

—Казічак, я больш ніколі так рабіць не буду! — ледзь не валялася ў мужа ў нагах. — Піць кіну, за гаспадаркай глядзецьму.

—Не веру! Ты ўжо клялася-бажылася не адзін раз, аднак усё застаецца па-ранейшаму. — У Казіміра ад гневу ажно вочы пабялелі. — Вон з дому і каб я цябе больш не бачыў!

—Як гэта вон?! — у Тамары таксама прачнулася злосць. — Я, канешне, вінаватая, справядліва ты мяне пакараў, але каб з дому праганяць… Мы ж з табой яго разам будавалі, сыноў выгадавалі і ім дапамаглі дамы пабудаваць у нашым аграгарадку. Я ж працавала… І каб вось так праганяць…

—Не так праганяць. Я табе грошай дам. Шмат. Можаш сабе якую хату купіць ці ў аграгарадку, ён жа непадалёку, ці дзе ў іншым месцы, а жыць ты са мной больш не будзеш! Гэта ж падумаць: я працую, і кожную хвіліну душа павінна ныць, як там дома з такой гаспадыняй? Ты іншым часам і хату спаліш. Не-е-е. Выплачу табе грошы, і ідзі сабе на ўсе чатыры бакі. Хочаш прапівай іх, а хочаш скарыстай для добрай справы.

Ён так і зрабіў. Назаўтра адпрасіўся з работы і паехаў у райцэнтр, зняў з банкаўскага рахунку грошы. Іх і сапраўды магло хапіць на хату і сціплую мэблю. Але Тамара, адчуўшы ў руках цяжкі пакунак з купюрамі, вырашыла, што называецца, пажыць для сябе. Яна пайшла ў суседнія Якімаўцы да адзінокай і беспрабудна п'янай Васіліны Томчык. Накупілі віна і сталі балявацъ. Брудныя, з апухлымі тварамі, яны штодзень цягаліся ў магазін і затарваліся віном. Вяскоўцы казалі, што да іхняй кампаніі часта далучаліся і мужчыны-апойкі з усёй ваколіцы.

—Навошта ты, Казімір, пусціў свае грошы на вецер? — пыталі мужчына ў Млынарчыка. — Прап'е за пару месяцаў.

—А няхай хоць за тыдзень, — махнуў ён рукой. — Затое цяпер мая галава спакойная: што пакінуў дома, тое і застаў. А пры ёй можна было ўсяго чакаць.

Грошы ў Тамары раставалі, як снег у сакавіку. Што прапівалася, а што сабутэльнікі раскрадалі, калі яна п'яная ў вусцілку валялася на брудным Васіліным ложку. Яе пакуначак з купюрамі стаў для апойкаў, як кажуць бывалыя ў пэўных мясцінах людзі, абшчаком. А ў канцы восені, калі над зямлёй пачалі лятаць белыя мухі, каса апусцела. З горада прыехала Васілініна дачка Міра, разагнала п'янае кодла, замкнула хату і забра-


МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

ПОДПИШИСЬ ПРЯМО СЕЙЧАС!

ПОДПИСНАЯ ЦЕНА НА 1–Е ПОЛУГОДИЕ 2015 ГОДА			
«Газета Слонимская» + «Отдушина»	на 1 месяц	на квартал	на полугодие
	30 000	90 000	180 000

«ГАЗЕТУ СЛОНИМСКУЮ» МОЖНО КУПИТЬ В МАГАЗИНЕ «КОНТИНЕНТ», КОТОРЫЙ НАХОДИТСЯ НА УЛ. ПУШКИНА, 13 ТЕЛ. 8-044-58-42-151 ВЕЛ.

ПРОДАЁМ ДВЕРИ ЛАМИНАТ САЙДИНГ



ЧТУП Якацук, УНП 590857937



«ГАЗЕТУ СЛОНИМСКУЮ» МОЖНО КУПИТЬ В МАГАЗИНЕ «АЛЬФА», КОТОРЫЙ НАХОДИТСЯ НА УЛ. Я. КУПАЛЫ, Д.3

В широком ассортименте представлена
• бытовая техника • электроника
• мягкая мебель (рассрочка 0%)
• сувениры и многое другое
Скидка на сковородки 50%
Товар недели — стиральная машина Zanussi
У нас можно оформить кредит наличными
В магазине имеется инфокиоск для оплаты коммунальных и платежей по кредиту
Рады видеть вас по адресу: ул.Я.Купалы, д.3, тел. 6-82-82

ЧПТУП «Энеротрейд», УНП 590323571

СЛОНІМ НА ПАЖОЎКЛЫХ СТАРОНКАХ

У СЛОНІМ ДА ПУСЛОЎСКАГА ПРЫЛЯТАЎ ПЕРШАПРАХОДЗЕЦ У АВІЯЦЫІ І ПРЭЗІДЭНТ АЭРАКЛУБА ГЕРМАНСКАГА РЭЙХА

Самалёт прэзідэнта аэраклуба германскага рэйха Вольфганга фон Гранау, які праславіўся шматразовымі пералётамі праз Атлантыку і кругасветным палётам, прызямліўся ў Дзравянчыцах пад Слонімам 1 траўня 1938 года а 17-й гадзіне.

Як пісала тагачасная газета "Слова", яго суправаджаў генерал Петэрсан, камендант аэрапорта ў Берліне, які падчас вайны на працягу двух гадоў жыў у Альбярціне.

Замежныя госці накіраваліся ў Альбярцін, дзе гасцявалі ў пана Пуслоўскага. У часе колькідзённага гасцявання замежнікі пабывалі на паляванні. Вылецелі са Слоніма 4 траўня.

ХТО ТАКІ ВОЛЬФГАНГ ФОН ГРАНАУ?

Вольфганг фон Гранау (1893-1977) — ваенны дыпламат, генерал-маёр, з 1934 года выконваў абавязкі прэзідэнта Германскага аэраклуба. У 1939 годзе быў залічаны ў люфтвафэ і прызначаны ваенна-паветраным аташэ ў складзе германскага пасольства ў Токіа.


ФОТА M.LITFILE.NET

Вольфганг фон Гранау

У 1930 годзе перасёк Паўночную Атлантыку з усходу на захад за 44 гадзіны ў адкрытым гідрасамалёце.

У 1932 годзе здзейсніў кругасветны палёт. Агульны час палёту склаў 254 гадзіны і працягласць шляху — 44 800 км (Грэнландыя, Паўночная Амерыка, Японія, паўднёвы Кітай, Філіпіны, Бірма, Індыя, Персія, Афіны і Рым).

Наталля ІВАНОВА

РОЗЫСК

ПОМОГИТЕ НАЙТИ ЧЕЛОВЕКА

Слонимский райотдел Следственного комитета расследует уголовное дело по факту безвестного исчезновения Буяка Юрия Романовича, 30.06.1965 года рождения, зарегистрированного по адресу: г.Слоним, ул.Черняховского, 2-5, который 23.04.2001 года уехал на заработки в Москву Российской Федерации и с того момента всякую связь с родственниками прекратил. До настоящего времени его местонахождение не установлено.

Его приметы: на вид 50 лет, рост 170 см, среднего телосложения, волосы тёмно-русые, лицо овальное, брови дугообразные, глаза голубые, нос прямой, основание горизонтальное, губы тонкие, подбородок вертикальный, уши овальные, средние, носит усы.

Особые приметы: родимое пятно на шее диаметром 1 см, послеоперационный шрам вследствие удаления аппендикса.

Кому что-либо известно о местонахождении Буяка Ю.Р., просим сообщить в Слонимский райотдел Следственного комитета по телефонам 5-54-68, 5-52-27 либо в Слонимский РОВД по тел. 102

Дмитрий ПОДБЕРЁЗКИН,
следователь отдела

ДА ВЯСНЫ...

ла маці да сябе, прыгразіўшы, што калі тая будзе піць, то скіне з дзявятага паверха.

Бедная Млынарчыха не ведала, што рабіць, куды падацца. Вырашыла прасіць літасці ў сыноў, якія абыходзілі яе, так бы мовіць, дзясятай дарогай, але іншага выйсця не было.

—Я ж вас з Дзімкам нарадзіла, выгадавала, а цяпер засталася без кала і двара, — ныла яна перад малодшым Колем, знайшоўшы яго ў калгаснай майстэрні, дзе працаваў токарам.

—Быў у цябе, маці, і кол, і двор, і ў двары, то трэба было шанаваць, а ты ўсё прапіла. То якія да нас з Дзімам пытанні? Між іншым, ты да яго нават не падыходзь, бо так папрэ, што і не азірнешся ні разу. У яго трэцяе дзіця ўчора нарадзілася, зноў дзяўчынка. Ён расстроены. Не да цябе.

—То што мне рабіць? Падкажы, сынок…

—Я цябе ў сваю хату не вазьму, бо ведаеш, як мая Таня адносіцца да апойкаў, асабліва да цябе. Так што нават і думаць забудзь. Хіба завязу вечарам да бацькавай сястры цёткі Мані ў Зброддзе. Яна адна жыве.

Аднак Маня сустрэла іх на ганку сваёй хаты ледзь не з дзеркачом.

—Вон адсюль! — накінулася на братавую. — Мала таго што Казіку жыццё паламала, то і сюды прывалаклася. А табе, пляменнічак, не брыдка? Твая маці, ты і глядзі, то не, прыпёр да мяне.

З тым і паехалі. Па дарозе Коля завярнуў у блізкую вёску Жоўдзікі да свайго сябра Пятра Мікіцкага і папрасіў у яго ключы ад старой дзедавай хаты, што стаяла крышку наводшыбе. Там ужо даўно ніхто не жыў. Пётр даў ключы без развагі.

—Дзякуй табе, — узрадавалася Тамара. — Мне б толькі дажыць да вясны, а там нешта прыдумаю…

У такім становішчы яна не магла нічога прыдумаць ні вясной, ні летам, але ж на нешта спадзявалася.

Назаўтра Коля прывёз машыну папілаваных і пасечаных дроў. Тамара было наважылася скласці іх у касцёр, але так хацелася выпіць, што гэты занятак неўзабаве кінула. Пазаўчора паштальёнка прынесла ёй пенсію, і грошы, так сказаць, мулялі ў кішэні. Яна сцягалася ў магазін і купіла тры бутэлькі віна, паўкілаграма кількі, хлеба. На радасці, што ўсё так удала складваецца і ёй ёсць дзе жыць, выпіла, закусіла, потым запаліла ў печы. Дровы былі сырыя і ніяк не хацелі займацца полымем. Язычок агню то выскачыць на палена, то зноў схаваецца. Знайшла ў кладоўцы жмут старых газет і, палячы іх, дамаглася цяпельца. Яшчэ падкінула паленаў і, зморaная цяжкім алкагольным сном, пайшла ў запечак на ложак.

Жвавы маленькі вугельчык выскачыў з печкі і кульнуўся на газеты, што ляжалі паблізу, прапаліў у адной дзірачку. Спачатку газета задымела, а потым узялася полымем. З яе полымя перакінулася на шпалеры, якімі была абклеена блізкая сцяна. Сталі дыміцца старыя занавескі на вокнах, лахманы, што віселі на сцяне…

Што гарыць хата, здагадаліся вясковыя жанчыны Кацярына Кірман і Валя Пушэвіч, якія ішлі па вуліцы. Іх насцярожыла, што надта ж свецяцца вокны, і пазванілі пажарным.

У хаце згарэла ўсё, але сам будынак ацалеў. Тамара Млынарчык была нежывая, але не абгарэла. На яе азызлым ад спіртнога твары назаўсёды застыла ціхая ўсмешка. Можа, яна ў сне ўбачыла, што дажыла да вясны, бо надта марыла пра гэта…

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Доброе утро, Слоним!



Пожалуй, единственный день в году, когда во всём мире позволяется быть… дураком, — это 1 апреля. И почему только единственный?! Как писал один российский бард: «Дураком быть выгодно, да очень не хочется. Умным очень хочется, да кончится битьем…»

Ещё короли почитали «дурацкое» ремесло шутов. Все тогда знали, что клоун у трона — единственный, чью правду слушает король. Да и шутом не всяк мог быть, как и не все с чувством юмора умны! Некоторые умники и сегодня предпочитают быть смешными, чтобы избежать ненависти окружающих.

А между тем слово «дурак» самое распространенное оскорбление. Поступки «дураков» чаще всего непонятны, а раз непонятны — значит, неправильные и дурацкие. Например, основатель генетики Иоганн Мендель много раз при жизни был осмеян современниками за «дурацкие опыты с горохом». Сегодня же каждый биолог зубрит его законы, без которых генетика была бы отброшена на много лет назад. А таблица Менделеева, увиденная им во сне, долгое время не признавалась химиками. Они высказывались с гневом и возмущением: «Как можно включать в курс точной науки выдуманные элементы, что за спекуляция с атомными весами? Это научный труд или толкователь снов?!» Многое в науке, культуре и искусстве, без чего сегодня мы не можем обходиться, изначально было встречено насмешками и неверием.

И, кстати, о вере. Всем известный Ной, который около 100 лет строил ковчег и каждый день говорил, что будет потоп, — слыл в народе большим дураком. Как ни просил он людей раскаяться в своих злодеяниях и войти в ковчег спасения — «умники» не верили и погибли. Высоко в горах Турции, недалеко от границы с Арменией, есть горная вершина Арарат, где в закоулке под толстым неподвижным льдом до поры до времени покоится Ноев ковчег. Как говорит один ученый археолог: «Бог держит ковчег в глубокой заморозке, и в нужное время Он достанет его оттуда».

— Сэр, вы умный человек?

Алёна АЛЬКО

АФИША

КИНОТЕАТР «МИР»



1 апреля

Зал — «Мачо и ботан 2», США, комедия, сеансы в 18.00 и 20.00

Видеосалон — «Деревенские крокодилы», США, ужасы, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

2 апреля

Зал — «Мачо и ботан 2», США, комедия, сеансы в 18.00 и 20.00

Видеосалон — «Деревенские крокодилы», США, ужасы, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

3 апреля

Зал — «Духлесс 2», Россия, драма, сеансы в 18.00 и 20.00

Видеосалон — «Деревенские крокодилы», США, ужасы, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

4 апреля

Зал — Детский сеанс «Барбоскины», Россия, мультфильм, начало в 14.00, «Духлесс 2», Россия, драма, сеанс в 16.00. Детская дискотека, начало в 18.00

Видеосалон — «Деревенские крокодилы», США, ужасы, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

5 апреля

Зал — Детский сеанс «Барбоскины», Россия, мультфильм, начало в 14.00, «Духлесс 2», Россия, драма, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

Видеосалон — «Деревенские крокодилы», США, ужасы, сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

ТЕАТР



5 апреля

Детям — «Новый колобок», начало в 12.00, цена 25 000 руб.

Взрослым — Капустник и «Прымакі», начало в 17.00, цена 40 000 рублей

Заглянем у сямейны альбом

Паважаныя чытачы! Калі ў вас захаваліся цікавыя старыя сямейныя фотаздымкі, дасылайце іх да нас у рэдакцыю з апісаннем гісторыі здымка, і мы з задавальненнем надрукуем іх у рубрыцы "Заглянем у сямейны альбом".

Пішыце нам на паштовы адрас: 231800, вул. Чырвонаармейская, 41, Слонім, Гродзенская вобласць, РБ, альбо дасылайце здымкі і тэксты па электроннай пошце gs@gs.by, альбо дзяліцеся інфармацыяй па тэл. 5-09-31, 6-36-58.

Арыгінал фотаздымка абавязуемся захаваць і вярнуць уладальніку.

Рэдакцыя

МЕЛЬКАНОВИЧСКИЕ ШКОЛЬНИКИ



На снимке, который был сделан в 1959 году, запечатлены ученики 2-го и 4-го классов Мелькановичской школы.

Сейчас этим школьникам уже за 60, а возможно, кого-то уже нет в живых.

В среднем ряду вторая слева девятилетняя Раиса Заяц. Теперь у 64-летней Раисы Васильевны, которая проживает в деревне Костени Слонимского района, семеро детей и десять внуков.

Раиса Васильевна почти всех на снимке помнит по имени и фамилии, но как сложились судьбы многих, не знает.

Если кто-то узнал себя или своих знакомых на фото, дайте знать.

Татьяна ДЕНИСЮК

Фото из личного архива Раисы ЗАЯЦ

ОБРАЗОВАНИЕ

БОЛЬШАЯ ПЕРЕМЕНА:
Вся власть Советам, ученикам раздать ваучеры и вернуть 12 классов



С чего начать модернизацию системы среднего образования и кто возьмет ответственность за ее проведение?

Об этом шла речь на конференции «Модернизация системы образования Беларуси: надежды и разочарования», которая недавно состоялась в Минске.

ДЕНЬГИ ИЗ БЮДЖЕТА — УЧЕНИКАМ

Поскольку Беларусь подала заявку на вступление в Болонский процесс, то, прежде всего, следует знать: куда идет цивилизованный мир. Так считает заместитель председателя Общества белорусской школы Тамара Мацкевич.

— Необходимо изучить, какое образование будет востребовано, для чего мы проводим реформы. Шаг второй: изучение методов, их эффективности, а также опыта стран, которые прошли через реформы, — предлагает Тамара Мацкевич.

По мнению эксперта, белорусские школы должны быть самостоятельными юридическими лицами, а руководить учебным заведением должен совет. Также, по словам Тамары Мацкевич, целесообразно перейти на новую систему финансирования школ, когда деньги из бюджета распределяются не на учебное заведение, а непосредственно ученикам в виде ваучера.

— Школьник сам разместит свой ваучер в выбранное учебное заведение, которое сформирует свой внутренний бюджет в зависимости от количества заявок. Это создаст конкуренцию внутри системы образования и более широкую возможность для появления разных видов школ: частных, церковных, общественных, — отмечает Тамара Мацкевич.

ДАЙТЕ ПРАВО РОДИТЕЛЯМ

Член Общественного Болонского комитета Андрей Лаврухин считает необходимым вернуть в Беларуси 12-летнее школьное образование.

Переход в 2008 году на 11-летнее обучение белорусских детей привел к сокращению и упрощению программ. В результате снизился уровень образованности школьников, о чем свидетельствует централизованное тестирование.

Помимо этого, как считает эксперт, для улучшения качества образования необходимо перейти к совмещенному независимому оцениванию уровня знаний выпускников и ввести практику составления рейтинга средних общеобразовательных учреждений.

Министерство образования, по мнению Тамары Мацкевич, должно утверждать стандарт. А родителям надо дать право влиять на содержание школьных программ.

— Необходима также деидеологизация образования. Все эти изменения можно назвать одним словом: «демократизация», — подчеркивает заместитель председателя Общества белорусской школы.

ГДЕ НАЙТИ КАДРЫ, КОТОРЫЕ РЕШАТ ВСЕ?

В настоящее время, по словам Тамары Мацкевич, существуют противоречия между заявленным на бумаге и реальным положением дел. Например, в каждой школе есть советы, родительские комитеты, но все они с правом лишь совещательного голоса.

— В Барановичах проводится эксперимент по ваучерному финансированию. Однако на практике только часть местного бюджета распределяется соответственно количеству учеников. При отсутствии у родителей выбора школы это вообще карикатура, — отмечает эксперт.

Тамара Мацкевич обращает внимание на то, что реформа образования может встретить мощное сопротивление со стороны неподготовленных педагогов и родителей.

— Так было в Словакии. Боюсь, и у нас может случиться нечто подобное. Не представляю, что мы будем делать, если у нас появится больше свободы. Хватит ли у нас кадров, чтобы заполнить, например, Министерство образования людьми со стратегическим мышлением? — говорит Тамара Мацкевич.

КТО РЕАЛИЗУЕТ ПРОГРЕССИВНЫЕ ИДЕИ?

Эксперт Агентства гуманитарных технологий Светлана Мацкевич отмечает, что даже при самых демократичных законах невозможно реформировать систему образования без улучшения общей атмосферы в стране.

–– Можно бесконечно изучать международный опыт, но без политической воли эти изменения невозможны, –– подчеркивает Светлана Мацкевич.

Руководитель проекта «Летучий университет», методолог Владимир Мацкевич отмечает, что в Беларуси существует проблема качества управленческого аппарата.

–– Оно становится все хуже, а чиновники менее ответственными. Еще с советских времен персональный кадровый состав оставался неизменным, а люди вынуждены были приспособиться к тем течениям, тенденциям, которые возникли с приобретением независимости, — говорит методолог.

Образование не может быть вне политики, считает Владимир Мацкевич. Для того чтобы проводить политику, нужна воля и самостоятельность, на что Министерство образования никогда не претендовало.

— Минобразования всегда действовало с оглядкой на власти. Без царя в голове оно не работает, а царь воплощен в начальственном органе, — подчеркивает эксперт.

По его мнению, присоединение Беларуси к Болонскому процессу не гарантирует проведение модернизации национальной системы образования.

Эксперт считает, что для проведения реформ не хватает не только политической воли властей, компетентных чиновников, но и активности общественных организаций, родителей школьников.

— Нет также действенного механизма, с помощью которого можно было реализовать прогрессивные идеи, — констатирует Владимир Мацкевич.

P.S.

Напомним, что реформа системы образования выбрана в качестве одного из приоритетных направлений в рамках проекта «Реформум».

Виктор ЛИСТОПАДОВ, «Завтра твоей страны»

СМЯРОТНАЕ ПАКАРАННЕ

ЦЕЛЫ РАССТРАЛЯНЫХ ЗНІКАЮЦЬ БЯССЛЕДНА


Тамара Сялюн

Маці расстралянага Паўла Селюна накіравала зварот у Канстытуцыйны суд, у ім яна звяртае ўвагу, што практыка прывядзення смяротнага пакарання ў выкананне і арт. 175 Крымінальна-выканаўчага кодэксу Рэспублікі Беларусь прыносіць душэўныя пакуты родным і блізкім пакараных.

У звароце Тамара Сялюн кажа, што абстаноўка поўнай сакрэтнасці пра час прывядзення пакарання і месца пахавання, адмова ў выдачы целаў расстраляных раўнацэнныя запужванню і пакаранню сем'яў расстраляных. Гэта пакідае блізкіх пакараных у стане нявызначанасці і псіхалагічным стрэсе. Такія дзеянні з боку дзяржавы можна расцаніць як катаванні родных расстраляных, а таксама жорсткае і бесчалавечнае абыходжанне з імі, што супярэчыць ч. 3 арт. 25 Канстытуцыі Рэспублікі і Беларусь. Акрамя таго, і арт. 7 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, які Беларусь ратыфікавала.

Канстытуцыйны суд нядаўна прыслаў Тамары Сялюн адказ на яе зварот, дзе спасылаецца на тое, што ў сваёй дзейнасці ён прымае рашэнні аб ліквідацыі ў нарматыўных прававых актах недахопаў, выключэнні ў іх калізій і прававой недакладнасці.

Што ж тычыцца адпаведнасці арт. 175 Крымінальна-выканаўчага кодэкса Канстытуцыі і міжнародным дамовам, то падобныя пытанні Канстытуцыйны суд разглядае на падставе адпаведных прапаноў ўпаўнаважаных органаў — Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Таксама ў адказе адзначаецца, што для грамадзян у Беларусі ўстаноўлены толькі ўскосны доступ да канстытуцыйнага правасуддзя.

"Калі Вы мяркуеце, што нормы Крымінальна-выканаўчага кодэкса, якія рэгулююць парадак выканання пакарання ў выглядзе смяротнай кары, супярэчаць Канстытуцыі і міжнародна-прававым актам, ратыфікаваным Рэспублікай Беларусь, то з пытаннем аб унясенні ў Канстытуцыйны суд прапановы аб праверцы іх канстытуцыйнасці Вы маеце права звярнуцца да вышэйназваных ўпаўнаважаных органаў", — удакладняе ў сваім адказе Канстытуцыйны суд.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

ЗНЯВОЛЕННЕ ПРАЦЯГНУЛІ НА ГОД


Мікалай Дзядок

Мікалай Дзядок у адкрытым лісце, звернутым да праваабаронцаў і "ўсіх, для каго словы «справядлівасць», «гуманізм» і «чалавечая годнасць» не пусты гук", апісвае злоўжыванні адміністрацыі ў дачыненні да палітвязняў і яго асабіста, якія, на думку праваабаронца Алеся Бяляцкага, з'яўляюцца сапраўднымі катаваннямі зняволенага ў турме.

"Адкрыты ліст Мікалая Дзядка расплюшчвае вочы на страшную праўду аб тым, што адбываецца ў беларускіх калоніях і турмах у дачыненні да зняволеных. Адміністрацыя калоніі фармальна прыкрываецца "законнымі" правіламі ўнутранага распарадку і псіхалагічна і фізічна тэрарызуе зняволеных, якія імкнуцца захаваць чалавечую годнасць. Больш за тое, як гэта адбылося з Мікалаем Дзядком, была ўзбуджаная справа па артыкуле 411 КК і ён атрымаў дадатковы год зняволення.

Ціск на палітзняволеных спецыяльна арганізоўваецца ўладамі Беларусі з мэтай выбіць у іх просьбу аб памілаванні...

Такога не павінна быць!" — напісаў праваабаронца.

Паводле spring96.org

Апавяданне

Хто пераможа?

Дзядуля Аляксей і яго ўнук-другакласнік Змітрок няспешна ідуць па тратуары. Сёння нядзеля. У школу ісці не трэба.

Змітрок спыняецца насупраць тоненькай бярозкі, якая расце на зялёным лужку непадалёку ад тратуара. Верхавінка бярозкі старанна перабінтаваная. Маленькія клейкія лісточкі на верхавінцы звялі, апусціліся ўніз.

— Хтосьці паламаў верхавінку бярозкі! Паднялася рука! — зірнуўшы на дзядулю, усклікнуў Змітрок і часта-часта, як перад плачам, заморгаў вачыма.

— А нехта пашкадаваў, перабінтаваў верхавінку! — заўважыў дзядуля Аляксей.

— Ён хоча, каб прыжылася яна! — прамовіў Змітрок і, ступіўшы некалькі крокаў, асцярожна дакрануўся да пакалечаной верхавінкі.

— Добра і зло змагаюцца, унучак! — гледзячы на бярозку, прагаварыў дзядуля Аляксей і адчуў, як зашчымела на душы.

— Добра пераможа, дзядуля? — хочацца ведаць хлопчыку. Незвычайнай жывой сілай уяўляюцца яму добра і зло.

— Перамога, калі ты яму дапаможаш, — сказаў дзядуля Аляксей.

— Дзядуля, ты тут пастой, а я дамоў пабягу! — нечакана заявіў унук.

— Нешта забыўся дома?

— Вадзіцы ў вядзерцы прынясу і палью бярозку, — паведаміў Змітрок і подбегам накіраваўся дамоў.

Дзядуля Аляксей паглядзеў услед унуку і ўсміхнуўся. Пасвятлела ў яго на душы.

Аляксей ЯКІМОВІЧ



МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

Сканворд

Фото 1 — 1 (JUVENTUS); Фото 2 — 2 (Arsenal); 3 (Real Madrid); 4 (Inter).

Озвучил Матроскина в мультфильме | Материал для колобка | Дасаев | Фото 4 | Хеттская богиня | Фото 1 | Промахнувшийся вожак | Пастушковый журавль | Обитель Аполлона | Река в Грузии | Экзотический фрукт | Фото 3 | Барабанное оружие | Экипаж принцессы | Холодное кушанье | Тропическая «шишка» | Турецкий сосед | Фото 2 | Столица XVIII зимних Олимпийских игр | Стих Лермонтова | Попугай | Прядь волос | Морское животное | Певица Кетч | Русское «Бинго» | Отец у тюрков | Мяч в воротах | Звезда в Тельце | Верблюд | Огнедышащий змей | «Буква» музыки | Порок зазнайки

ОТ ВЛАДИМИРА ВАШУТЫ

Слово-пароль



Заочный клуб «Что? Где? Когда?»

ВЫБИРАЕМ ЗНАТОКА СЛОНИМА

Дорогие друзья! В борьбу за звание знатока Слонима в этом раунде вступили четыре участника. Однако любой желающий может присоединиться к нашей игре и попробовать свои силы в интеллектуальном марафоне!

Вопросы и ответы V раунда:

• 1. Младенцы это делают 2 раза в минуту. Взрослые — от 10 до 30 раз в минуту. Делают это и некоторые куклы. А вот стрекоза это вообще не делает. Что не делает стрекоза? — **Не моргает.**

• 2. Что называл один китайский поэт белыми 6-лепестковыми цветами? — **Снежинки.**

• 3. Слёзы часто сравнивают с камнями: русские видели в них жемчуг, ацтеки — бирюзу. А с каким камнем слезы сравнивают прибалты? — **Янтарь.**

• 4. Говорят, что его нельзя родить, но легко убить. Где его много, оно стоит, где мало — несется вскачь. Его часто крадут, но никогда не возвращают. Что это? — **Время.**

• 5. Какими словами мог бы начинаться донос Пятачка в налоговую инспекцию? — **«Хорошо живет на свет Винни-Пух...»**

Итоги V раунда:

Анастасия ТРОФИМЧИК — 5 баллов
Виктория КОРОЛЬ — 3 балла
Николай РАКЕВИЧ — 4 балла
Анна РЕЖАБЕК — 5 баллов

Вопросы VI раунда:

• 1. Назовите фамилию пивовара, который начал выпускать книгу с самыми-самыми...

• 2. Как зовут сказочного героя, который был самым лучшим в мире рисовальщиком петухов?

• 3. В этой — обычно сигнальной — трубе можно обнаружить одержимого поклонника-фаната и осветительный прибор.

• 4. Какой музыкальный инструмент получил своё название от слова «каштан»?

• 5. Что означал написанный красной краской древнекитайский иероглиф «петух»?

Присылайте ответы на электронную почту zhannapleshko@gmail.com или в SMS-сообщении на номер 8 029 133-04-21 до 6 апреля (также вы можете просто позвонить по этому номеру и озвучить ответы). Не забудьте указать свое имя и фамилию!

По итогам 10 туров (за правильный ответ начисляется 1 балл) будет определен победитель — лучший знаток Слонима.

Говорят дети

Мама пытается снять свитерок с двухлетней дочурки, но что-то голова застряла. Дочка испуганно:

— Мама! Где я?

Дочка рассказывает, как зовут деток в ее группе в детском саду:

— Катя, Никита, Радибога...

Мама в недоумении:

— Как?!

— Радибога. Ей воспитательница все время говорила: «Ради бога, не плачь».

Купили два граната. Ребенок, очарованно:

— О, какие шиповники!

Старонку падрыхтавала Наталля ІВАНОВА

Намеснік галоўнага рэдактара
Мікола КАНАНОВІЧ
Журналісты
Уладзімір ШУМЕЛЬ
Яўген ВАЛАДАШЧУК
Кацярына ЯНУШЭВІЧ
Таццяна ДЗЕНІСЮК
Алена КАСЦЮК
Стыль-рэдактар
Жанна ПЛЕШКО

Галоўны бухгалтар
Юлія ЛІБІК
Бухгалтар
Вольга БУРСЕВІЧ
Аддзел падпіскі і продажу
Аляксей НАВІЦКІ
8-(029) 322-06-42
Вёрстка і дызайн
Уладзімір КАЧАРГА
Алена ДЗЯТЛАВА

Тэлефоны рэдакцыі:
т/факс: **8 (01562) 5-09-31,**
Тэл. 6-36-58, 6-36-68, 6-36-54, 6-36-44.
МТС: **8-029-584-87-32**
Velcom: **8-029-133-04-21**
Skype — gazslon
(9.00-18.00)
Для карэспандэнцыі:
231799, г. Слонім,
вул. Чырвонаармейская, д. 41
e-mail: gs@gs.by,
gazslon@gmail.com
© «Газета Слонімская» Спасылка на «ГС» абавязковая

Рэкламная служба
Начальнік рэкламнай службы
Ганна ВАЛАДАШЧУК
anna@gs.by
8-(029) 612-26-43
Супрацоўнікі
Наталля СТРУПАВЕЦ
Людміла КАМЯНЕЦКАЯ
Наталля СЕМЯНОВІЧ
8-(044) 715-90-03
8-(01562) 4-61-16
(9.00–16.00)
т/факс:
8-(01562) 5-09-27
Ⓚ Матэрыялы публікуюцца на правах рэкламы

Прыём аб'яў і падпіска:
г. Слонім, Чырвонаармейская, 73 Б
(будынак АРЗ)
Працуем аўторак — пятніца 9^{00}-17^{00}
субота — нядзеля 9^{00}-15^{00}
выхадны — панядзелак
8-(044) 762-48-39

Аўтары апублікаваных матэрыялаў адказваюць асабіста за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі. Рэдакцыя не вядзе перапіскі з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць. Рэдакцыя таксама не адказвае за змест рэкламы.

УВАЖАЕМЫЕ ЧИТАТЕЛИ! "Давай познакомимся"
Хотите встретить свою вторую половинку, но у вас это не получается? "ГС" поможет вам найти друг друга.
Давайте объявление, приносите свои фото с кратким рассказом о себе. И ваша мечта станет...
Женщина, пенсионного возраста, желает найти друзей для общения, ведущих здоровый образ жизни, те, кому одиноко, звоните. Тел. 8-029-584-06-49.

ЗЕМЛЯНЫЕ РАБОТЫ
УСЛУГИ МИНИ-ЭКСКАВАТОРА И ПОГРУЗЧИКА
• КОММУНИКАЦИИ •
• СНОС МЕЛКИХ СТРОЕНИЙ •
• ПЛАНИРОВКА УЧАСТКОВ •
• ФУНДАМЕНТЫ •
• ВОДОЁМЫ •
+375 44 771 19 77 +375 29 558 49 55
Тимофейчик Ю.В., УНП 590095887

погода на неделю

	утро	день	вечер
СРЕДА, 1 апреля	3°	5°	4°
ЧЕТВЕРГ, 2 апреля	2°	5°	3°
ПЯТНИЦА, 3 апреля	2°	7°	5°
СУББОТА, 4 апреля	2°	5°	4°
ВОСКРЕСЕНЬЕ, 5 апреля	-2°	5°	1°
ПОНЕДЕЛЬНИК, 6 апреля	-2°	4°	-3°
ВТОРНИК, 7 апреля	2°	3°	2°
СРЕДА, 8 апреля	2°	4°	2°

www.meteoprog.by

www.elit-profi.jimdo.com ЧУП «ЭЛИТ-ПРОФИ» УНП590136344
MONTBLANC
ЭлитПрофи
собственное производство
ОКНА И ДВЕРИ ПВХ
АЛЮМИНИЕВЫЕ БАЛКОННЫЕ РАМЫ
замер, доставка – БЕСПЛАТНО!
Только сейчас и только у нас-
АКЦИЯ
пенсионерам, многодетным семьям скидки!!!
г. Слоним ул.Первомайская,17
Тел. 8 (01562) 5-05-43, 8 (029) 199-46-62
SALAMANDER INDUSTRIE PRODUKTE

АлексМАН производственное предприятие
СОВРЕМЕННЫЕ ТЕХНОЛОГИИ
ОКНА ДВЕРИ
Пожалуй, лучшие окна!
• из пвх и алюминия • • раздвижные балконы •
• межкомнатные двери • • металлические двери •
г. Слоним, ул. Красноармейская, 83 а
тел./факс (01562) 4-12-11
Velcom: (029) 35-35-781, 35-35-782
ЧПУП "Алексман" УНП 590930059, собственное производство

Окна в дом! Деньги потом!
Рассрочка!
Сроком от 3 до 9 месяцев
Предоплата 30%
6% СКИДКА!
Наличная оплата
Оформление за 5 минут
Предоплата 30%
23% СКИДКА!*
*При заказе изделия «под ключ»
ОДО «МегаБлок-Плюс» УНП 390518235
Звоните
8 (01562) 50 - 508
МТС/Velcom 683-6000
Окнаград
www.oknagrad.by

«СВАДЬБА МЕЧТЫ — 2015»

ПРОЕКТ ФОТОГРАФА ВЛАДИМИРА ЯНУШЕВИЧА

В Слонимском центре культуры и отдыха прошла «Свадьба мечты». Организовал это мероприятие слонимский фотограф Владимир Янушевич при поддержке общественных организаций и предприятий города.

Праздничный тон мероприятию задавали местные артисты.

Песни о любви пели Ирина Жукова, Игорь Дударчик и Ольга Кандрусик. Народный ансамбль песни «Славяночка» показал, как в недалеком прошлом совершались некоторые моменты свадебного обряда. Также выступил коллектив «Браво» — Мария и Вячеслав Хлестовские. Несколько танцев в исполнении девушек показала студия восточного танца «Лейла». Еще выступили гости из Зельвы — свадебные музыканты Елена и Владимир Перевалово.



Файер-шоу исполняет участник группы SapFire

Народный коллектив «Славяночка» встречал пару караваем

А в фойе на втором этаже все желающие могли посмотреть выставку свадебных декораций, изделий ручной работы, фотографий и видео и бесплатно продегустировать продукцию местного винзавода, мясокомбината, хлебозавода. Корреспондент «ГС» встретился там с организатором проекта.

— Владимир Владимирович, для чего Вы создали проект «Свадьба мечты»?

— Это городское мероприятие мы проводим в третий раз. Его цель — семейные отношения, любовь, дети. Хотелось показать традиционные отношения между людьми, которые решили создать семью и вступают в супружеский союз, то есть играют свадьбу. На этом мероприятии присутствуют люди, которые занимаются обслуживанием и популяризацией свадеб — проводят фотовидеосъемку, готовят соответствующий декор, украшения и изделия ручной работы, музыкальное сопровождение, оказывают услуги парикмахера-визажиста, организуют путешествие во время медового месяца.

— Фотография — главное дело Вашей жизни?

— Да, документальное и художественное фото является главным делом моей жизни. Фотография — это работа и хобби. В следующем году я намерен расширишь проект «Свадьба мечты», пригласить новых участников, чтобы шире популяризировать семью как ячейку общества.

Вечером слонимчане смогли увидеть файер-шоу в исполнении группы SapFire.

Владимир ШУМЕЛЬ
Фото Екатерины ЯНУШЕВИЧ


ЖИВОТНЫЕ ИЩУТ ДОМ

ПОТЕРЯЛСЯ МОНТИК

Около двух недель назад в районе улицы Брестской потерялась собака Монтик. Была замечена около центрального рынка.

На собаке был бордовый ошейник со стразами.

Если Вы видели собаку, позвоните. Тел. 8-029-979-45-95.



Ведущая рубрики Татьяна ПЛАХЕТКО
tanyaplahetko@gmail.com

«ПИНСКДРЕВ» СНИЖАЕТ НА МЕБЕЛЬ ЦЕНЫ!
ТОВАРИЩ, КВАРТИРЕ НУЖНЫ ПЕРЕМЕНЫ!
ПИНСКДРЕВ
www.pinskdrev.by
Период проведения акции: 20 марта - 31 мая 2015 г.
Представительство ЗАО "Холдинговая компания "Пинскдрев" в г.Гродно с магазинами УНП 500573599
Об акциях, скидках и условиях рассрочки спрашивайте в фирменном магазине "Мебель Пинскдрев":
г.Слоним, ул.Красноармейская, 73а тел.: 8 (01562) 5-09-46
тел.: 8 (033) 654-00-46

Дзякуй за тое, што выбралі "Газету Слонімскую"!

Галоўны рэдактар Віктар Уладзіміравіч Валадашчук, victor@gs.by

ЗАСНАВАЛЬНІК Віктар Уладзіміравіч ВАЛАДАШЧУК
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах

Рэгістрацыйнае пасведчанне №64 ад 05.03.2009 года, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.

email: gs@gs.by
gazslon@gmail.com
Юрыдычны адрас: 231800, г.Слонім, вул. Чырвонаармейская, 41
Тыраж 5010 экз.

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (льготная)
Свабодны кошт

Час падпісання да друку па графіку 31 сакавіка 2015 года 16:00.
Аб'ём — сем умоўных друкаваных аркушаў.

Надрукавана ў друкарні ГАУПП "Гродзенская друкарня" г.Гродна, вул. Паліграфістаў, 4, індэкс 230025.
Заказ № 1937